**12 верасня ў рамках 6-га школьнага дня для вучняў 2-9 класаў быў арганізаваны Дзень Здароўя пад дэвізам “Спорту – ТАК! Жыццю – ТАК!” У праграму Дня здароўя ўвайшлі спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы “Шкаліяда”. Школьнікі спаборнічалі ў бегу на 30 м, кіданні мяча на далёкасць**




**і скачках у даўжыню. Падчас спаборніцтваў удзельнікі праявілі ўпорства і настойлівасць, паказалі свае фізічныя якасці: спрыт, сілу і каардынацыйныя здольнасці. Пасля спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы прайшла таварыская сустрэча па валейболе-піянерболе. І ў заканчэнні Дня Здароўя вучні адправіліся ў г.Смалявічы на чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па хакеі на траве сярод жаночых каманд (першы тур) ХК “Вікторыя” і СДзЮШАР ХК “Мінск – РЦАП” у якасці балельшчыкаў. Пасля гульні, у якой перамогу атрымалі хакеісткі “Вікторыі” з лікам 8:0 зрабілі агульны здымак з камандай ХК “Вікторыя”, падзякавалі хакеісткам за прыгожую гульню і павіншавалі з перамогай.**






**Удзельнікі Дня Здароўя атрымалі шмат пазітыўных эмоцый, добрага настрою і выказалі жаданне весці здаровы лад жыцця.**

